# ЗЯРНЯТКА 20

21 студзеня 2018 г. III Звычайная нядзеля, Год B

Кайцеся і верце ў Евангелле — Мк 1, 14-20

Пасля таго, як выдалі Яна, прыйшоў Езус у Галілею, прапаведуючы Евангелле Божае і кажучы, што настаў час і наблізілася Валадарства Божае: кайцеся і верце ў Евангелле.

Праходзячы ж каля Галілейскага мора, убачыў Сымона і Андрэя, брата Сымона, якія закідалі сеткі ў мора, бо яны былі рыбакамі. І сказаў ім Езус: Ідзіце за Мною, і Я зраблю вас рыбакамі людзей. І, адразу пакінуўшы сеткі, яны пайшлі за Ім.

Адышоўшы крыху далей, Ён убачыў Якуба Зэбэдэевага і Яна, брата ягонага, якія таксама сядзелі ў чаўне і ладзілі сеткі. І адразу паклікаў іх. І, пакінуўшы бацьку свайго Зэбэдэя ў чаўне з работнікамі, яны пайшлі за Ім.

*Гэта слова Пана.*



**Дай спазнаць Твае дарогі, Пане.**

# Знайдзі на малюнку ўсе схаваныя рэчы.




## Малітва.

Хвала Табе, Пане Езу, за цудоўны свет, які Ты стварыў для мяне. За магчымасць вучыцца і хадзіць у школу. Дзякую Табе за мой розум і мае таланты і здольнасці. Дапамажы мне, Езу, карыстацца Тваімі дарамі мудра і правільна. Дапамажы мне развіваць свае таланты і здольнасці. Будзь са мной, Езу, не толькі ў касцёле, але і ў школе і дома. Амэн.